# «Я ПАТРЭБНЫ ШКОЛЕ…»

Усяга, што выклікала і выклікае ўнутраны пратэст у сучаснай школе, проста быць не можа побач з гэтым чалавекам.

Памятаю, як ішлі мы з ім, а дакладней сказаць, прабіраліся па калідоры. Перапынак. Пад метр восемдзесят акселераты-старшакласнікі—рух неймаверны. У сталовую, спортзалу, з кабінета ў кабінет. Да таго ж «музыка» школьнага перапынку гучыць на ўсю магутнасць. Праз пяць—дзесяць мінут усе разыйдуцца па сваіх месцах, рассядуцца, цішыня ўвойдзе ў школу. І дырэктар зоймецца сваімі прывычнымі справамі.

Вось такі школьны перапынак назірала я многа гадоў назад у сярэдняй школе № 44. Гэта ў той час, калі ўзорныя школы дэманстравалі на рознага рангу семінарах, як па калідорах з недзіцячай паважлівасцю прахаджваюцца парамі класы — ад першага да дзесятага. Сум і нічога больш мог выклікаць такі малюнак у разумнага педагога.

Здзіўленне і павага — вось два пачуцці, якія заўсёды выклікаў у мяне Мікалай Апанасавіч Лебедзеў.

Лічыцца, ды і па дакументах так, што працуе з дзецьмі і для дзяцей М. А. Лебедзеў з 1947 года. Але так і хочацца зрабіць своеасаблівы «перапразлік».

Бывае ў жыцці іншы раз, што нямала патопчаш сцяжынак, пакуль знойдзеш сваю. Лёс не даў М. А. Лебедзеву часу на роздум. Ён належыць да таго пакалення, якое семнаццацігадовым пайшло на фронт.

Трапіў у разведку. Пяць разоў быў паранены. Мае восем баявых узнагарод. Тры з іх — асаблівыя. Гэта — ордэны Славы.

Вось тут і прыходзіць думка, што не тады пачаўся Лебедзеў-педагог, калі пасля вайны паступіў у Курскі педагагічны інстытут, не тады, калі правёў першы ўрок у сваёй першай школе, што Буда-Кашалёўскім раёне. А яшчэ на вайне, вызваляючы зямлю нашу ад чужынцаў, ачышчаючы яе ад крыві І гора, змагаючыся за светлую будучыню для сваіх, будучых выхаванцаў.

Калі тры гады Вялікай Айчыннай вайны, дзень у дзень, рызыкуеш жыццём, ідзеш на гэта ў імя Радзімы, а значыць і ў імя кожнага яе сына і дачкі, то, напэўна. вось тут і пачынаецца свая кропка адліку. Як чалавека, як грамадзяціна, як педагога, які, ужо дзякуючы аднаму свайму аўтарытэту, выхоўвае.

...Здзівіць ведамі ў наш час цяжка, яны становяцца для чалавека такімі ж натуральнымі, як фізічная прырода. Але настаўнік павінен дасягнуць у сваім прад меце (перш за ўсё, зразумела, у ім) такога ўзроўню кампетэнтнасці, які б мог здзівіць, захапіць вучняў.

Але і гэтага мала: настаўнік павінен быць чалавекам высокай агульнай культуры, рознабакова развітым. Такая ўжо асаблівасць яго прафесіі: дзеці патрабуюць, каб ён ведаў усё. Гэта закладзена для іх у самім паняцці «настаўнік».

Акрамя эрудыцыі, няхай самай шырокай, аўтарытэт настаўніка залежыць яшчэ і ад прафесіянальнага майстэрства, якое патрабуе не столькі ўмення падаць веды, колькі ўмення арганізаваць пошук і набыццё ведаў самімі рабятамі, здольнасць захапіць іх сваёй навукай. Гэта педагагічнае крэда Мікалая Апанасавіча.

Шмат гадоў прабыў Мікалай Апанасавіч на дырэктарскай пасадзе. Розныя выпадкі здараліся за гэтыя гады. Расказваюць і пра такі. На выпускных экзаменах М. А. Лебедзеў паставіў дзве двойкі. Зразумела, скандал. Угаварыць яго спрабавалі многія. Але дырэктар стаяў на сваім. Так што не толькі гісторыю выкладаў Лебедзеў, і не толькі вучням. Іншы раз яму даводзіцца даваць урокі прынцыповасці.

Гэта ўжо ўсё з былога часу. Але вярнуцца да яго мне ўсё ж хочацца хаця б для таго, каб задаць Мікалаю Апанасавічу некалькі пытанняў. Напрыклад, у адну з нашых сустрэч ён гаварыў, што хацеў бы

пажадаць свайму пераемніку, паслядоўніку мець магчымасць поўнасцю займацца арганізацыйна-вучэбным і выхаваўчым працэсамі, рабіць сваю непасрэдную справу. Трэба вызваліць настаўнікаў ад неўласцівых ім функцый. А то чым толькі ні даводзіцца займацца...

Што ж змянілася?

— Магчыма крыху менш стала пакетаў, а ў астатнім... замест слоў — красамоўнае маўчанне. А потым працягвае: — Колькі школ працуе ў краіне на давер'і. Умешвацца ў жыццё школы без усялякай патрэбы — гэта варварства. Ёсць план работы школы. Ён не догма, але ж над ім працавалі, думалі. Вось вам прыклад зусім свежы. *23* мая абласны інстытут удасканалення настаўнікаў праводзіць семінар. Звоняць: дайце ўрокі. Дзеці нашы стаміліся, настаўнікі таксама: канец года. Ніякай увагі на гэтыя акалічнасці.

Па-ранейшаму дырэктар ходзіць у ролі прасіцеля. Але я з аптымізмам гляжу *ў* будучыню. Апошні Пленум ЦК КПСС — мне у гэтым падтрымка. Многія настаўнікі незадаволены: мала канкрэтыкі. А я лічу так: намечана — твары, дзейнічай. Іншая справа, што сапраўднай свабоды няма, няма магчымасці вар'іраваць вучэбныя планы. Настаўнік чакае перамен. А нам ужо прыйшлі вучэбныя планы на наступны год, і падручнікі тыя ж самыя будуць зноў...

І вось надышоў час. Адных ён палохае, для іншых — доўгачаканы. Пенсія. Рана ці позна гэта здараецца з усімі. Мікалай Апанасавіч з першага верасня 1987 года ўпершыню не пайшоў у сваю 44-ю. Яго веды заканамерна вызначылі яго прыход у абласное педагагічнае таварыства. На пасадзе намесніка гэтага таварыства Лебедзеў прабыў роўна месяц.

І гэтаму таксама ёсць тлумачэнне. З былымі дырэктарамі так здараецца: іх або не жадаюць больш бачыць у школе, або яны самі не жадаюць бачыць школу. У Мікалая Апанасівича трэці варыянт. Вось як ён сам пра гэта гаворыць:

— Ведаеце, магчыма тое, што я зараз скажу, прагучыць і не вельмі сціпла, але я адчуваю, што патрэбны школе. І вось я зноў тут. Зараз ужо — намеснік дырэктара па вучэбна – выхаваўчай рабоце.

Я знарок пакінула на самы канец размову пра званне ганаровага



Грамадзяніна горада, якое нядаўна прысвоена Мікалаю Апанасавічу Лебедзеву. Голас яго адразу змяніўся:

— Ведаеце, столькі гадоў жыву ў Гомелі і ведаю, што ў горадзе ёсць нямала дастойных людзей, якія заслужылі гэтае званне. А сам я і не ведаю, як да такога факта аднесціся. Не гатовы я да размовы на гэтую тэму. Адчуваю толькі, што адказнасці, абавязкаў у мяне прыбавілася.

...Колькі жыццяў дадзена пражыць чалавеку? Ці толькі адно? Ці не жывуць разам з намі, не кіруюць намі блізкія сэрцу людзі? Часцінка душы настаўніка заўсёды жыве ў нас. Толькі мы проста не заўважаем гэтага іншы раз. А настаўнікі нашы ведаюць. І яшчэ яны ведаюць, што дзеля гэтага варта жыць. Варта ўручную ўзводзіць складаны будынак асобы па цаглінках сумненняў, надзей і цяжкіх спроб. Я пра гэта даведалася ад Мікалая Апанасавіча Лебедзева.

**М. ШЫМАНОУСКАЯ.**